вывучэнню спецыяльных дысцыплін на дырыжорска-харавых кафедрах. Навучанне дырыжыраванню дае адчувальны вынік толькі тады, калі звязана з практыкай. Аналіз жа вучэбнага плана завочнага факультэта паказвае, што ў ім адсутнічае дысцыпліна "Практыка работы з хорам". На занятках харавога класа нельга вырашыць усе задачы, якія стаяць перад студэнтам.

На практыцы выходзіць, што праграма па дырыжыраванні ў дачыненні да завочнага факультэта мае на мэце хутчэй павышэнне кваліфікацыі да ўзроўню вышэйшай адукацыі, чым дэталёвае навучанне мастацтву кіравання і дырыжыравання вакальна-харавым калектывам. Каротка прааналізаваўшы асноўныя элементы курса "Харавое дырыжыраванне", неабходна з улікам іх асэнсаваць і сістэматызаваць работу студэнта-завочніка ў яе розных аспектах.

Гэта дасць магчымасць вызначыць шляхі ўдасканалення харавога дырыжыравання на завочным факультэце і дабратворна паўплывае на развіццё харавога мастацтва ў рэспубліцы ў цэлым.

*Даніленка Л.І., ст. выкладчык*

## НАВУЧАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАМУ ПОШУКУ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ ІНФАРМАЦЫІ ВА ЎМОВАХ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

На сучасным этапе тэрмін "бібліяграфічны пошук", які яшчэ ў пачатку 80-х гадоў ацэньваўся як неалагізм, заняў трывалае месца ў тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства. Працэс бібліяграфічнага пошуку з'яўляецца асновай бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання, арганічна спалучаецца з такімі напрамкамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, як камплектаванне бібліятэчных фондаў, стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату (ДБА) бібліятэкі, дакументальнае і фактаграфічнае абслу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гоўванне, бібліяграфічнае навучанне карыстальнікаў інфармацыі, метадычная і навукова-даследчая дзейнасць, менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы. Валоданне навыкамі бібліяграфічнага пошуку — важная ўмова прафесійнай самаадукацыі, павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Імклівыя і глыбокія перамены, якія адбываюцца ў апошнія гады ў розных сферах жыцця грамадства, актывізавалі патрэбы ў інфармацыі па сацыяльна-гуманітарных галінах ведаў: гісторыі, дзяржаве і праве, палітыцы, эканоміцы, педагагічных навуках, культуралогіі, мовазнаўстве, філасофіі , сацыялогіі, рэлігіязнаўстве.

Кола карыстальнікаў дакументнай сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ахоплівае людзей, прафесійна звязаных з рознымі сферамі сацыяльнай практыкі і грамадскіх навук. З дзелавымі матывамі да дакументаў прававой, эканамічнай тэматыкі ўсё часцей звяртаюцца спецыялісты іншых профіляў. Вучэбнымі мэтамі абумоўлены зварот да інфармацыі па сацыяльных і гуманітарных навуках навучэнцаў розных тыпаў дзяржаўных і недзяржаўных навучальных устаноў. Гістарычная, філасофская, рэлігійная і іншая літаратура вабіць аматара самаадукацыйнага чытання.

Ажыццяўленне бібліяграфічнага пошуку дакументных носьбітаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі, разнастайных па змесце, светапоглядной і ідэалагічнай накіраванасці, відавым складзе, крыніцазнаўчым значэнні, формах прадстаўлення і спосабах распаўсюджвання, аўтарстве, мове, перыядзе і месцы стварэння, месцы захавання, патрабуе спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў ад бібліёграфаў, якія спецыялізуюцца на інфармацыйным забеспячэнні заканатворчай, праваахоўнай, правапрымяняльнай дзейнасці, палітыкі, эканомікі, гуманітарных навук, адукацыі, культуры, сродкаў масавай інфармацыі, ваеннай справы, царкоўна-рэлігійнай сферы. Адпаведная прафесійная падрыхтоўка неабходная і супрацоўнікам іншых галіновых бібліятэчна-бібліяграфічных цэнтраў, універсальных навуковых і публічных бібліятэк.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Наша мэта — прааналізаваць вопыт навучання бібліяграфічнаму пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі на аддзяленні бібліятэказнаўства і бібліяграфіі факультэта завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры, вызначыць шляхі яго ўдасканалення.

Зыходнай базай для авалодання методыкай бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі для студэнтаў-завочнікаў з'яўляюцца веды, уменні і навыкі, набытыя пры вывучэнні агульнабібліяграфічных дысцыплін і інфарматыкі, у т.л. уяўленні аб відах бібліяграфічнага пошуку, пошукавых прыкметах, пошукавых вобразах запытаў і дакументаў, пертынентнасці, рэлевантнасці, паўнаце і дакладнасці пошуку, яго стратэгіі і тактыцы.

Вывучэнне методыкі бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі з улікам умоў розных тыпаў бібліятэк прадугледжана праграмай базавага курса "Бібліяграфія сацыяльна-гуманітарных ведаў". Курсы эканамічнай і педагагічнай бібліяграфіі засяроджваюць увагу на асаблівасцях пошуку адпаведнай галіновай інфармацыі ва ўмовах універсальных і спецыяльных навуковых бібліятэк.

Падрыхтоўка да бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ва ўмовах завочнага навучання ажыццяўляецца праз сістэму лекцыйных, семінарскіх і лабараторных заняткаў у спалучэнні з актыўнай самастойнай працай студэнтаў у міжсесіённы перыяд.

У лекцыйных курсах тэме бібліяграфічнага пошуку, адпаведна праграме, папярэднічае знаёмства з патрэбамі карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, складам яе дакументных, у т.л. бібліяграфічных, крыніц, асаблівасцямі арганізацыі сацыяльна-гуманітарнай часткі ДБА ў бібліятэках.

Лабараторныя заняткі і кантрольныя работы, пры выкананні якіх адпрацоўваюцца ўменні і навыкі бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, можна падзяліць на групы:

1) заняткі, на якіх ажыццяўляецца вывучэнне асобных відаў крыніц пошуку;

2) работы, якія прадугледжваюць непасрэднае выкананне бібліяграфічнага пошуку;

3) заняткі, на якіх адбываецца знаёмства з аўтаматызаванай тэхналогіяй бібліяграфічнага пошуку;

4) работы, накіраваныя на метадычнае асэнсаванне ўяўленняў аб бібліяграфічным пошуку.

У першай групе заняткаў — лабараторная работа "Выданні дзяржаўных дакументаў як крыніцы бібліяграфічнага пошуку". Пры яе выкананні студэнты знаёмяцца з пошукавымі магчымасцямі універсальных і тэматычных зборнікаў, монавыданняў дзяржаўных дакументаў, нарматыўных бюлетэняў органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад, ведамаснымі і міжведамаснымі нарматыўнымі бюлетэнямі Рэспублікі Беларусь. Аналізуецца відавы склад дакументаў, іх групоўка, навукова-даведачны апарат выданняў.

Да другой групы заняткаў належаць дамашняя кантрольная работа "Бібліяграфічны пошук афіцыйных дакументаў" і лабараторныя работы "Выкананне пісьмовай тэматычнай бібліяграфічнай даведкі грамадска-палітычнага зместу", "Пошук літаратуры па эканоміцы бібліятэчнай справы, бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці", "Выкананне розных відаў даведак па адукацыі і педагогіцы".

Увядзенне ў тэматычны план курса "Бібліяграфія сацыяльна-гуманітарных ведаў" кантрольнай работы па бібліяграфічным пошуку афіцыйных дакументаў было абумоўлена новым прававым статусам Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы і суб'екта міжнароднага права, станаўленнем шматпартыйнасці, дэмакратызацыяй грамадства і ўзросшай у сувязі з гэтым колькасцю запытаў на афіцыйныя дакументы ў бібліятэчна-бібліяграфічных установах.

Перыядычна абнаўляемыя індывідуальныя варыянты кантрольнай работы ўключаюць запыты на нарматыўныя акты, прынятыя Нацыянальным сходам, Прэзідэнтам і Урадам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя дакументы Расійскай Федэрацыі, іншых краін СНД і далёкага замежжа, акты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжнароднага права, дакументы палітычных партый, прафсаюзных, маладзёжных, рэлігійных і іншых грамадскіх арганізацый і аб`яднанняў. Кожным варыянтам прадугледжана выкананне найбольш распаўсюджаных відаў пошуку: удакладняючага бібліяграфічныя звесткі аб пэўным дакуменце і вытрымках з тэксту, тэматычнага бібліяграфічнага, пошуку дзеючых нормаў права. Студэнтам прапануецца ажыццяўляць пошук па поўнатэкставых і бібліяграфічных базах даных дзеючага заканадаўства, спецыялізаваных картатэках нарматыўна-прававой інфармацыі, афіцыйных альбо бібліяграфічных выданнях, электронных каталогах і іншых крыніцах. Схема афармлення кантрольнай работы акцэнтуе ўвагу на вызначэнні пошукавых прыкмет, відаў і шляху пошуку.

Пісьмовая тэматычная даведка грамадска-палітычнага зместу выконваецца на лабараторных занятках з элементамі дзелавой гульні. Выступаючы ў ролях карыстальніка інфармацыі і бібліёграфа, студэнты прымаюць запыт, фіксуюць яго ў бланку на тэматычную бібліяграфічную даведку, здзяйсняюць пошук па даведачна-бібліяграфічным апараце лабараторыі бібліяграфіі сацыяльна-гуманітарных ведаў БУК. Пры абмеркаванні выкананых даведак студэнты, што выступаюць у ролі карыстальнікаў інфармацыі, ацэньваюць паўнату раскрыцця тэмы ў даведцы і яе крыніцазнаўчае забеспячэнне, рэлевантнасць і пертынентнасць прадстаўленай інфармацыі.

У адрозненне ад папярэдняй работы, арыентаванай на задавальненне патрэб карыстальнікаў грамадска-палітычнай інфармацыі, занятых у розных сферах сацыяльнай дзейнасці, бібліяграфічны пошук літаратур па эканоміцы бібліятэчнай справы, бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці ажыццяўляецца з мэтай павышэння прафесійнай кваліфікацыі саміх бібліятэкараў і ўдасканалення дзейнасці бібліятэк ва ўмовах рынкавых адносін. Пераход эканомікі да рынку закрануў усе сферы дзейнасці, у тым ліку бібліятэчную справу, бібліяграфію, інфармацыйную дзейнасць. Развязаць вузлы фінансавых праблем, у т.л. выкарыстання валютных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фадкаў, цэнаўтварэння на інфармацыйныя прадукты і паслугі, укараніць прагрэсіўныя формы менеджменту і маркетынгу, рэкламу, кааператыўныя і іншыя формы арганізацыі працы ў бібліятэках і інфармацыйных установах зараз немагчыма без выкарыстання публікацый аб айчынным і замежным вопыце ў гэтай параўнальна "маладой" галіне эканамічнай дзейнасці.

Ведам і навыкам, набытым пры выкананні бібліяграфічнага пошуку па эканоміцы бібліятэчнай справы, бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці, уласціва высокая запатрабаванасць не толькі ў практычнай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці студэнтаў-завочнікаў, але і ў вучэбным працэсе — пры выкананні курсавых і дыпломных работ, вывучэнні курсаў бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту і маркетынгу, фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк.

Лабараторная работа "Выкананне розных відаў даведак па адукацыі і педагогіцы" ў метадычным плане адметная тым, што яе выкананне цалкам ажыццяўляецца на базе ДБА Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі.

Апрача таго, навыкі бібліяграфічнага пошуку як адной з аперацый працэсу бібліяграфавання напрацоўваюцца пры падрыхтоўцы агляду эканамічнай літаратуры. Рэалізацыя ўменняў бібліяграфічнага пошуку патрабуецца і пры распрацоўцы спісаў і аглядаў літаратуры да "Дня кафедры" як комплекснай формы бібліяграфічнага інфармавання карыстальнікаў інфармацыі ў галіне адукацыі і педагогікі. Метадычныя ўказанні да гэтых работ арыентуюць студэнтаў на пошук нарматыўна-прававых актаў, што рэгламентуюць прафесійную дзейнасць у адпаведнай галіне, выяўленне іншых відаў дакументаў — у адпаведнасці з мэтавым прызначэннем, пошук літаратуры на розных мовах, адлюстраванне матэрыялаў, якія прадстаўляюць розныя падыходы да вырашэння актуальных праблем.

Знаёмства з аўтаматызаванай тэхналогіяй пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў базах даных, лакальных камп'ютэрных інфармацыйных сетках бібліятэк і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

INTERNET адбываецца пры наведванні такіх цэнтраў бібліяграфіі сацыяльна-гуманітарных ведаў, як Нацыянальная і Прэзідэнцкая бібліятэкі, РНПБ, бібліятэка Інфармацыйнага цэнтра Пасольства ЗША і іншых.

Увасабленне ўяўленняў аб методыцы бібліяграфічнага пошуку ў форме метадычных парад, кансультацый, пакладзенае ў аснову вылучэння заняткаў чацвёртай групы, практыкуецца пры выкананні лабараторнай работы "Пошук літаратуры па эканоміцы бібліятэчнай справы, бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці", падрыхтоўцы і правядзенні "Дня кафедры". У першым выпадку студэнты афармляюць кансультацыю па методыцы бібліяграфічнага пошуку эканамічнай літаратуры для бібліятэкараў-бібліёграфаў. Абавязковай з'яўляецца наяўнасць у іх рэкамендацый па выкарыстанні вынікаў пошуку ў разнастайных напрамках дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў. Прыкладнай праграмай "Дня кафедры" прадугледжана распрацоўка кансультацый па бібліяграфічным пошуку і методыцы работы з афіцыйнымі, даведачнымі, інфармацыйнымі выданнямі і базамі даных па адукацыі і педагогіцы, падрыхтоўка выступленняў аб формах і метадах бібліяграфічнага абслугоўвання педагогаў.

Асноўнымі формамі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ва ўмовах завочнага навучання з'яўляюцца абарона дамашніх кантрольных работ, экзамены. Важна, што ў білеты дзяржаўных экзаменаў, акрамя праграмных тэарэтычных пытанняў па гэтай тэме, для ўсіх спецыялізацый уключаюцца і заданні практычнага характару.

З тэарэтычнага, арганізацыйнага і методыка-тэхналагічнага пунктаў гледжання стратэгічны накірунак удасканалення працэсу навучання бібліяграфічнаму пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі вызначаецца тэндэнцыямі развіцця сістэмы дакументальных камунікацый сучаснага грамадства, яго аўтаматызацыяй.

У тэарэтычным плане неабходная далейшая распрацоўка тэрміналагічных праблем, звязаных з працэсам бібліяграфічнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічнага пошуку. Шматлікія класіфікацыі відаў пошуку, прадстаўленыя на сённяшні дзень у навуковых, нарматыўна-вытворчых і вучэбных выданнях, здзяйсняюцца па розных крытэрыях: мэце і сродках пошуку, пошукавых прыкметах. Адсутнасць уніфікаваных класіфікацый інфармацыйнага, бібліяграфічнага пошуку ўскладняе засваенне ўяўленняў аб ім у вучэбным працэсе.

З арганізацыйнага боку важна, што навучанне бібліяграфічнаму пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ва ўмовах завочнага навучання у значнай ступені залежыць ад забеспячэння інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэчна-бібліяграфічных устаноў — месц працы студэнтаў-завочнікаў, вучэбных лабараторый і бібліятэкі універсітэта, а таксама доступу да інфармацыйных рэсурсаў вядучых цэнтраў бібліяграфіі сацыяльна-гуманітарных ведаў у Рэспубліцы Беларусь і сусветных рэсурсаў інфармацыі.

Улічваючы, што інфармацыйна-рэсурсная база бібліятэчна-бібліяграфічных устаноў, дзе працуюць студэнты завочнай формы навучання, знаходзіцца на розных узроўнях развіцця і не забяспечвае аднолькавых умоў для набыцця практычнага вопыту інфармацыйнага пошуку, важна забяспечыць вучэбныя лабараторыі неабходнымі для ажыццяўлення такога пошуку навейшымі сродкамі: поўнатэкставымі базамі даных Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, інфармацыйна-прававога агенцтва “Рэгістр”, ТАА “Софтінфарм”, рознымі відамі выданняў афіцыйных дакументаў, бібліяграфічнымі, даведачнымі выданнямі сацыяльна-гуманітарнай і універсальнай тэматыкі, іншымі крыніцамі. Паралельна з гэтым неабходна аптымальна выкарыстоўваць у навучальным працэсе электронныя і традыцыйныя каталогі, картатэкі бібліятэкі БУК, яе базы даных (“Працы выкладчыкаў БУК”, “Хрысціянства на Беларусі”), даведачна-бібліяграфічны фонд. У перыяд сесій пажадана максімальна задзейнічаць магчымасці універсальных і галіновых рэспубліканскіх бібліятэк, спецыялізаваных інфармацыйных цэнтраў, арганізуючы экскурсіі па загадзя ўзгодненай праграме, правядзенне лабараторных заняткаў,

наведванне навукова-практычных канферэнцый, заняткаў па павышэнні кваліфікацыі супрацоўнікаў гэтых цэнтраў і ў іншых формах.

У метадычным аспекце найбольш актуальнымі з'яўляюцца: 1) распрацоўка лабараторных заняткаў, спецкурсаў і курсаў на выбар, арыентаваных на засваенне аўтаматызаванай тэхналогіі пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, напрыклад, у аўтаматызаваных базах даных прававой і бізнес-інфармацыі; 2) камплектаванне вучэбных лабараторый і бібліятэкі БУК метадычнымі парадамі для карыстальнікаў баз даных; 3) перавыданне метадычных матэрыялаў па методыцы бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі для студэнтаў-завочнікаў у выглядзе метадычных указанняў для самастойнай работы, зборнікаў наглядных дапаможнікаў, тэкстаў лекцый; 4) мэтанакіраванае выкарыстанне ў працэсе навучання галіновых рубрыкатараў і класіфікацый дакументных носьбітаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, у т.л. выкарыстоўваемых у міжнародных інфармацыйных сетках, у прыватнасці, класіфікатараў нарматыўных актаў, рубрыкатара ЮНЕСКА, класіфікацыі Дзьюі і іншых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дзямешка Л.А., прафесар*

## АСАБІСТЫЯ ЯКАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКА І ІХ УПЛЫЎ НА СТУДЭНТАЎ ФЗН

Студэнты факультэта завочнага навучання БІС уяўляюць у асноўным працуючых бібліятэкараў, маладых дзяўчат і жанчын, якія павышаюць свой адукацыйны статус. Многія з іх прыйшлі атрымаць вышэйшую адукацыю пасля заканчэння Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума, маюць сем'і, пэўны багаж прафесійных ведаў і стаж працоўнай дзейнасці. Вядома, такі кантынгент студэнтаў патрабуе ад выкладчыкаў ФБІС высокага прафесіяналізму і пэўных асабістых якасцей.